# Сем крокаў у прафесію

**Праблема прафесійнага самавызначэння заўсёды была надзвычай важнай як для кожнага канкрэтнага чалавека, так і для ўсяго грамадства ў цэлым. Толькі праца ў адпаведнасці са сваімі здольнасцямі прыносіць чалавеку задавальненне ад зробленага, і ў выніку грамадства атрымлівае прафесіянала высокага класа. З улікам спецыфікі Слонімскага раённага цэнтра творчасці дзяцей і моладзі, шматпрофільнасці дзейнасці ўстановы, педагагічным калектывам была распрацавана мадэль прафесійнага станаўлення асобы “Сем крокаў у прафесію”.**

## У пошуках уласнага стылю

Мадэль ахоплівае ўсіх навучэнцаў установы дадатковай адукацыі і навучэнцаў школ горада і вёскі, плаўна ўліваецца ў адукацыйны працэс, не перагружаючы пры гэтым ні навучэнцаў, ні педагогаў. Мерапрыемствы, якія праводзяцца ў рамках рэалізацыі мадэлі, дзеляцца ў залежнасці ад зместу і формы правядзення на групы — крокі ў прафесію.

Крок першы — гэта прафесійная арыентацыя на занятках аб'яднанняў па інтарэсах. Адукацыйныя праграмы многіх аб'яднанняў Цэнтра творчасці дзяцей і моладзі маюць канкрэтную прафесійную накіраванасць. Так, на занятках аб'яднанняў па інтарэсах “Свой стыль” і “Залаты напарстак” педагогі дадатковай адукацыі ствараюць умовы для выяўлення навучэнцамі сваіх творчых ідэй праз стварэнне эскізаў адзення і пашыў вырабаў. Таксама яны знаёмяць вучняў з такімі прафесіямі, як мадэльер, канструктар, тэхнолаг, швачка, і такім чынам уводзяць іх у прафесіі мастака-мадэльера, мадэльера-канструктара, тэхнолага.

Аб'яднанне па інтарэсах дэкаратыўна-прыкладной творчасці “Вясёлка” знаёміць хлопчыкаў і дзяўчынак з мастацтвам лепкі з гліны і прафесіямі, звязанымі з ім: ганчар, скульптар, архітэктар, дызайнер.


У гасцях — выпускнікі.

Значным прафарыентацыйным патэнцыялам валодаюць праграмы мастацкага профілю аб'яднанняў па інтарэсах “Арт-Колер”, “Гумка”, “Палітра”, “Свет творчасці”, якія з'яўляюцца цэласным інтэграваным курсам па вывучэнні розных відаў і жанраў выяўленчага мастацтва (жывапісу, скульптуры, архітэктуры і г.д.). Педагогі дапамагаюць навучэнцам паспрабаваць сябе ў ролі мастакоў розных спецыяльнасцей. Пры маляванні ў тэхніцы пейзаж — мастаком-жывапісцам, пры стварэнні ілюстрацый да кніг — мастаком-ілюстратарам, пры маляванні архітэктурных помнікаў — мастаком-манументалістам. У малодшых узроставых групах дзеці любяць прымяраць на сябе прафесію мастака-мультыплікатара і скульптара, а навучэнцы старэйшага ўзросту — мастака-дызайнера адзення і абутку.

Шырокія магчымасці для падрыхтоўкі вучняў да свядомага выбару сферы будучай прафесійнай дзейнасці дае адукацыйная праграма “Асновы журналістыкі”. Амаль усе заняткі аб'яднання праходзяць на базе тэлеканала “Слонім ТБ”. Тут дзеці вывучаюць асновы журналістыкі побач з прафесіяналамі. Як пісаць навіны? Што такое інтэрв'ю? Як стаць вядучым навін? На гэтыя і тысячы іншых цікавых пытанняў адказваюць не проста тэарэтыкі журналістыкі, а практыкі. Пры гэтым вучні спрабуюць сябе ў прафесіях журналіста, аператара і мантажора.

Дапамагаць падлеткам быць самімі сабой, станавіцца больш упэўненымі ў сабе заклікана адукацыйная праграма мастацкага профілю “Школа прыгажосці”, якая прадугледжвае работу над фарміраваннем паставы, паходкі, над доглядам скуры, валасоў, цела, а таксама навыкам публічнага выступлення. “Школа прыгажосці” развівае эстэтычны густ, этычныя якасці асобы, знаёміць з прафесіямі мадэлі, цырульніка, візажыста, касметолага.



Майстар-клас па дрэве.

Праграмы адукацыйных галін “Тэатральная творчасць”, “Дзіцячы тэатр” і “Амплуа” знаёмяць хлопчыкаў і дзяўчынак з тэатральнымі прафесіямі: рэжысёр, акцёр, грымёр, касцюмер, швачка, пасціжор, дэкаратар, мастак-дэкаратар, музыкант.

Няхай не ўсе навучэнцы ў далейшым выберуць прафесію па профілі навучання ў аб'яднанні па інтарэсах, але атрыманыя веды і ўменні сфарміруюць той падмурак, на якім будуць пабудаваны такія важныя ў сучасным свеце прафесійныя якасці, як творчасць, мабільнасць, крэатыўнасць, добразычлівасць, інтэлект.

## Пашыраем спектр прафесій

Важным рэсурсам у павышэнні якасці падрыхтоўкі вучняў да прафесійнага старту з'яўляецца сфера педагагічна-рэгулюемага вольнага часу. Такім чынам, другі напрамак у прафарыентацыйнай дзейнасці (крок другі) — гэта праведзенне выхаваўчых мерапрыемстваў. Іх мэта — уключыць вучняў у розныя віды дзейнасці, арыентаваныя на пашырэнне кругагляду аб працоўных прафесіях і спецыяльнасцях, прафесіях сферы абслугоўвання. Так, пры падрыхтоўцы да традыцыйных конкурсаў “Ратавальнікі вачыма дзяцей”, “Выконваем законы дарог”, “Мая будучыня — бяспека працы маіх бацькоў”, “Свет прафесій”, “Прафесія будучыні” навучэнцы аб'яднанняў дэкаратыўна-прыкладной творчасці і выяўленчага мастацтва знаёміцца з усім спектрам прафесій, якія маюцца ў Слоніме.

Трэці напрамак рэалізацыі прапанаванай мадэлі (крок трэці) — экскурсійная дзейнасць. У Слонімскім раённым цэнтры творчасці дзяцей і моладзі гэта знаёмства з прафесіямі і спецыяльнасцямі падчас наведвання прамысловых і абслуговых прадпрыемстваў, прафесійна-тэхнічных устаноў адукацыі Слоніма.


Падчас экскурсіі ў швейны цэх.

Падчас дзён адкрытых дзвярэй навучэнцы атрымліваюць інфармацыю аб патрабаваннях, што прад'яўляюцца да вучобы і яе змесце, аб прафесійных магчымасцях у выбраных галінах, праводзяцца сумесныя майстар-класы, дзелавыя гульні, прафесійныя пробы.

## Па бацькоўскай сцежцы

Яшчэ адзін кірунак работы па рэалізацыі мадэлі “Сем крокаў у прафесію” — правядзенне дзён сельскага школьніка. Для папулярызацыі ўстановы дадатковай адукацыі, разнастайнасці форм вольнага часу і развіцця творчых здольнасцей навучэнцаў устаноў адукацыі аграгарадкоў і сельскіх школ, якія не маюць магчымасці наведваць аб'яднанні па інтарэсах на працягу навучальнага года, арганізавана правядзенне дзён сельскага школьніка ў рамках шостага дня. Праходзяць яны ў апошнюю суботу кожнага месяца. Дзейнасць установы ў гэты дзень накіравана на арганізацыю і правядзенне комплексу культурна-масавых мерапрыемстваў з прафарыентацыйным акцэнтам.

Праграма правядзення дня сельскага школьніка разнастайная: навучэнцы нашай установы выступаюць з творчымі прэзентацыямі сваіх аб'яднанняў па інтарэсах, разам з педагогамі яны ладзяць майстар-класы, творчыя пляцоўкі па дэкаратыўна-прыкладной творчасці, выяўленчым мастацтве і тэатральным майстэрстве, конкурсна-гульнявыя праграмы.



На фабрыцы мастацкіх вырабаў.

У значнай ступені ўплываюць на выбар навучэнцаў прафесіі іх бацькоў, таму татаў і мам мы таксама падключаем да прафарыентацыйных мерапрыемстваў. Найбольш цікавы вопыт правядзення інтэрактыўных форумаў, майстар-класаў для навучэнцаў і бацькоў. Так, пры нефармальных зносінах бацькі назіраюць, ацэньваюць здольнасці і поспехі свайго дзіцяці, вучацца паважаць яго інтарэсы і намаганні, успрымаць сур'ёзна дзіцячы намер звязаць будучую прафесію з пэўным відам дзейнасці.

Найбольш эфектыўнымі формамі работы з бацькамі з'яўляюцца інтэрнэт-перапіска, інтэрнэт-асвета, дні адкрытых дзвярэй (бацькоўскія дні), у рамках якіх мамы і таты далучаюцца да прафарыентацыйнай работы як спецыялісты. Яны атрымліваюць магчымасць пазнаёміць навучэнцаў са сваёй прафесійнай дзейнасцю, пры гэтым статус бацькоў значна павышаецца ў вачах навучэнцаў. Таксама ў гэтыя дні яны ўдзельнічаюць у конкурсных праграмах, дзе могуць паспаборнічаць са сваімі дзецьмі, зрабіць сумесна карысныя рэчы, наведваючы майстар-класы.

## Наказ ад выпускнікоў

Крок шосты — узаемадзеянне з выпускнікамі ўстановы дадатковай адукацыі. Для навучэнцаў падлеткавага ўзросту, якія стаяць на шляху выбару будучай прафесіі, вельмі важна меркаванне равеснікаў і старэйшых хлопчыкаў і дзяўчынак, таму частымі гасцямі ў аб'яднаннях па інтарэсах розных профіляў і кірункаў дзейнасці з'яўляюцца выпускнікі ўстановы дадатковай адукацыі. Педагогамі кожнага аб'яднання па інтарэсах сабраны і вядзецца банк даных навучэнцаў, якія наведвалі аб'яднанне па інтарэсах і навучаюцца або працуюць па профілі аб'яднання, у якім займаліся. Гэтых навучэнцаў запрашаюць у шосты школьны дзень, і яны расказваюць пра прафесіі, якія ўжо асвоілі або асвойваюць, — швачкі, мадэльера, тэхнолага швейнай вытворчасці, мастака, архітэктара, дызайнера, культарганізатара, настаўніка польскай мовы, журналіста. Іх аповеды, прэзентацыі і майстар-класы дапамагаюць сфарміраваць дакладнае ўяўленне аб розных прафесіях, разуменне іх ролі ў жыцці чалавека і грамадства, развіць устойлівую цікавасць да заняткаў у аб'яднанні па інтарэсах, спрыяюць самавызначэнню навучэнцаў.

У межах мадэлі прафесійнага станаўлення асобы навучэнцаў “Сем крокаў у прафесію” працягваецца работа па прафарыентацыі дзяцей і падлеткаў у летні перыяд у профільных лагерах — гэта крок сёмы.

Нашы педагогі распрацавалі праект, накіраваны на стварэнне камфортнага, аздараўленчага, творчага, пазнавальнага, гульнявога асяроддзя для адпачынку, далейшага развіцця творчых здольнасцей і прафесійнага самавызначэння дзяцей. Удзельнікі праекта — вучні, якія займаюцца ў аб'яднаннях па інтарэсах установы. Ім даецца магчымасць працягнуць заняткі ў нефармальнай сяброўскай атмасферы, спалучаючы іх з цікавымі конкурснымі і гульнявымі праграмамі, экскурсіямі, гульнямі на свежым паветры, а таксама магчымасць прымераць на сябе цікавыя прафесіі ў займальнай гульнявой форме, паўдзельнічаць у прафесійных пробах.

Зладжаная і актыўная работа ўсяго педагагічнага калектыву Слонімскага раённага цэнтра творчасці дзяцей і моладзі дазваляе ў поўнай меры рэалізаваць мадэль прафесійнага станаўлення асобы навучэнцаў “Сем крокаў у прафесію” і, адпаведна, праграму прафесійнай арыентацыі. Ролю дадатковай адукацыі ў развіцці схільнасцей, здольнасцей і інтарэсаў дзяцей і моладзі, у іх асобасным, сацыяльным і прафесійным самавызначэнні цяжка пераацаніць.

**Ірына ЛОГВІНАВА,
метадыст Слонімскага
раённага цэнтра творчасці
дзяцей і моладзі.**